*Ю. Л. КАЗАКОЎ*

# ЭТНІЧНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ДУХАВЕНСТВА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У КАНЦЫ XV – ПАЧАТКУ XVII ст.

Рассматривается этноконфессиональная ситуация, которая сложилась на белорусских землях в конце XV–XVII вв., на основе анализа документов делается попытка определить этническую принадлежность духовенства основных христианских конфессий, ислама и иудаизма.

The ethnoconfessional situation which developed on Byelorussian lands at the end of the XV$^{th}$–XVII$^{th}$ centuries is considered. On the basis of the analysis of documents it defines the ethnic origin of clergy of the main Christian faiths, Islam and Judaism.

Вызначаны перыяд у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ), як і ў большасці еўрапейскіх краін, характарызаваўся надыходам Новага часу. Адбылося палітычнае аб'яднанне асобных зямель у адзіную федэратыўную дзяржаву, на гэтым падмурку к XVI ст. завяршаўся працэс фарміравання беларускай народнасці. Узмацнілася цэнтралізацыя, істотныя змены назіраліся ў эканоміцы. З'яўляючыся натуральнай, феадальная гаспадарка паступова ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны, што садзейнічала пераадоленню лакальнай зачыненасці асобных тэрыторый і ўплывала на этнічную кансалідацыю. Паралельна з эканамічным развіццём удасканальвалася саслоўная структура тагачаснага грамадства, узрастала колькасць насельніцтва, якое к канцу XVI ст. складала каля 2,6 млн асоб, з якіх 1,8 млн жылі на тэрыторыі Беларусі[1].

Побач са шляхтай да пануючага саслоўя ў ВКЛ адносілася духавенства. Дзяржава была шматканфесійнай і ў ёй былі прадстаўлены тры рэлігіі: хрысціянства, іслам і іўдаізм. Гэта накладала адпаведны адбітак на духоўнае развіццё грамадства і адлюстроўвалася ў саслоўнай стратыфікацыі. Пачынаючы з 30-х гг. XVI ст. у ВКЛ з'явілася Рэфармацыя, якая затым змянілася Контррэфармацыяй. У выніку хрысціянскія канфесіі набылі новае аблічча і побач з традыцыйным праваслаўем і каталіцтвам існавалі ўніяцтва і пратэстантызм.

Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ амаль да канца XVI ст. праваслаўная царква была інтэгравана ў грамадска-палітычную структуру дзяржавы, карысталася прывілеямі і падтрымлівалася феадаламі. Паралельна развівалася яе арганізацыйная структура, будаваліся цэрквы, манастыры, ажыццяўлялася місіянерская дзейнасць, што прыводзіла да павелічэння колькасці духавенства. Пасля таго як у 1385 г. паміж ВКЛ і Польшчай была ўсталявана дынастычная унія, праваслаўная царква была пазбаўлена шэрагу прывілеяў. Аднак ужо ў 1443 г. вялікі князь Казімір, а ў 1499 г. яго пераемнік Аляксандр ураўнялі ў маёмасных правах праваслаўную царкву з каталіцкай. На такі крок яны вымушаны былі пайсці не толькі з-за вялікай колькасці праваслаўных, але і таму, што беларускія і ўкраінскія феадалы складалі каля 4/5 ад агульнай колькасці ў ВКЛ, а на ўсходзе і поўдні Беларусі – больш за 90 %[2].

У выніку па прывілею Віцебскай зямлі 1503 г. у «рускую веру» дазвалялася вольна хрысціцца ліцвіну або паляку[3]. У тым жа годзе ў Маскву прыехала літоўскае пасольства для падпісання міру, і ў наказе паслам, у прыватнасці, казалася: «...иж не есть потреба… всее Руси знову хрестить… церкви хто какие хочет, тот тые будует, так руским, так и римским. Аль-кольвек не дозволено было Руси церквей будовати, але тыми разы король его милость то им допустил»[4]. У жалаваных граматах 1592 г. Мінскім і Віленскім праваслаўным месцічам даравалася права «людям народу Руского, закону Греческого», «детей письма Греческого и Русского учити даровати» и «книги всякие старого и нового закону, такъ въ науцѣ школьной яко и въ церкви потребные, по Кгрецкому, по Славянску, по Руску и по Польску друкавати»[5].

Назва «рускі» азначала не толькі прыналежнасць да праваслаўнай веры, але і да этнасу. Таму праваслаўныя святары ў этнічных адносінах заўсёды выступалі ў якасці мясцовага беларускага насельніцтва. К XVI ст. большасць насельніцтва Беларусі называлася «рускія», «русіны», «Русь». Этнонім «рускія людзі» меў вялікае распаўсюджанне сярод жыхароў Усходняй Беларусі, і не выпадкова гісторык-славіст У. І. Ламанскі пісаў: «...Литовская Русь – разумеет народ русский, православный»[6]. Руская этнічная самасвядомасць таксама была характэрнай і для жыхароў паўночных і паўднёвых беларускіх зямель, якія ў складзе ВКЛ доўга захоўвалі такую назву. Таму гэты момант даволі доўгі час адлюстроўваўся ў поўным тытуле вялікіх князёў літоўскіх і польскіх каралёў. Напрыклад, у жалаванай грамаце 1457 г. Казімір IV называўся «Каралем Польским и великим князем Литовским и Русским и Жамойтским и иных земель», а яго пераемнік Аляксандр насіў тытул «велики князь Литовски, Руски, Жомойтски пан и дедич»[7]. Шматлікія факты сведчылі і аб тым, што з-за гэтых тэрыторый ішла доўгая барацьба з Маскоўскай дзяржавай. У стацейных спісах пасольстваў 1533–1538 гг. маскоўскі князь прэтэндаваў на «Кіевъ и Полотескъ, и Витебскѣ, городы Руские и иные городы, тъ из начала отчины государей нашихъ»[8]. Факты сведчылі аб тым, што канфліктуючыя бакі называлі гэтыя землі не інакай як рускія.

У Вялікім Княстве Літоўскім для святароў цэнтральнай і заходняй частак беларускіх зямель распаўсюджана была і назва «ліцвіны». Гэта было звязана з блізкасцю названых зямель да цэнтра дзяржавы, якая часта называлася проста Літва. Істотнае значэнне мелі і тыя абставіны, што ў гэтым рэгіёне жылі вялікія групы людзей балцкага (літоўскага) паходжання. Аднак калі першапачаткова саманазва духавенства «рускія» і «ліцвіны» мела чыста этнічны характар, то ў далейшым яна стала набываць палітычнае значэнне. Існуе вялікая колькасць дакументаў, дзе ўсе беларускія тэрыторыі называліся «Літва». Так, у Летапісным зводзе 1497 г. паведамлялася аб разарэнні татарамі ўсходнеславянскіх зямель Літоўскага Княства і гэтыя тэрыторыі называліся «землі Літоўскія»[9]. У стацейных спісах пасольстваў 1501–1503 гг. таксама часта сустракалася назва «Літоўская зямля»[10]. Гэта сведчыла аб тым, што на падмурку дзяржаўна-палітычнай самасвядомасці для праваслаўнага духавенства ў XVI ст. паступова складалася агульная для ўсіх беларусаў форма саманазвы – палiэтнонім ліцвіны.

Становішча праваслаўнай царквы пагоршылася пасля Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. Большасць яе іерархаў на чале з мітрапалітам Міхаілам Рагозай перайшлі ў унію, пачалася барацьба за цэрквы і манастыры, мясцовыя ўлады ў шэрагу выпадкаў пачалі прымусова пераводзіць насельніцтва ва ўніяцкую веру. У выніку ў сярэдзіне XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім налічвалася каля 11 тыс. праваслаўных прыходаў, у той час як у 1621 г. у Рэчы Паспалітай было 2169 уніяцкіх і 1089 праваслаўных цэркваў[11].

Такая палітыка выклікала заклапочанасць усяго насельніцтва, і ў розныя інстанцыі пачалі паступаць пратэсты. Так, у 1608 г. у Віленскі гарадскі суд паступіла скарга Іпація Пацея і Марахоўскага на гарадскіх месцічаў Самуіла Сенчылу і Варфаламея Жалікоўскага, якія не падтрымалі дзеянняў уніяцкіх іерархаў. У ёй падкрэслівалася, што сябры гарадской ратушы «...с хизматицким трибом идучи, увесь славный руский народ – все тое панство и прилегшие ему поветы потурбовали и до седицей (заговоров) и бунтов привели»[12]. У 1623 г. ад праваслаўнай шляхты ВКЛ на Варшаўскі сойм паступіў ліст, у якім казалася: «Мы церпім найвялікшае беззаконне і жорсткія ўціскі, і ніхто ў нашай Айчыне не выкажа жадання нам дапамагчы. Ад нас адабралі права, свабоды, ды вольнасці... Якой жа згоды можна чакаць у нашай Радзіме, калі ад нас патрабуюць... знішчэння сваіх царкоўных і грамадзянскіх правоў, свабод і вольнасцей... Пакуль яшчэ захоўваецца поўная згода ў грамадзянскай уніі, то ў імя абароны цэласнасці Айчыны, а таксама дзеля захавання правоў, свабод і вольнасцей усіх народаў, неабходна... каб унія... была адменена... Бо лепш да бяды прадугледзець адмоўнае ў выглядзе перасцярогі, чым пасля няўдачы бездапаможна разважаць аб нядобрых наступствах. Няхай жа нарэшце Польшча, Літва і Русь прыйдуць да згоды, перш чым здарыцца няшчасце!»[13]

Дзяржава была вымушана паслабіць міжэтнічнае і міжканфесійнае супрацьстаянне на беларускіх землях. Каб супакоіць праваслаўных і пазбегнуць паўстанняў, кароль Уладзіслаў IV сваёй граматай ад 14 сакавіка 1633 г. дараваў усім «духоўным і мірскім народа Рускага Грэчаскай веры не сушчым у уніі... вольнае адпраўленне Боскай службы ва ўсіх месцах і манастырах у Польшчы, і ў Вялікім Княстве Літоўскім»[14]. На беларускіх землях была створана новая Магілёўская епархія, кіеўскім мітрапалітам прызначаны Пётр Магіла.

Аднак месца праваслаўнай царквы як этнічна рускай заняла ўніяцкая. У паведамленні папскага нунцыя ў Рэчы Паспалітай Тарэса аб стане ўніяцкай царквы ў 1622 г. паведамлялася, што на тэрыторыі Беларусі былі створаны: архібіскупства Полацкае, якое мела манастыры ў Магілёве, Полацку і трэцім горадзе; біскупства Пінскае, што займала частку тэрыторыі былой Віленскай епархіі. Частка тэрыторыі ВКЛ была ўключана ў Кіеўскае архібіскупства, якое мела 6 манастыроў, у тым ліку ў Гродне, Навагрудку, Вільні[15]. На тэрыторыі Беларусі быў створаны ордэн базылян, што заснаваў у XVII ст. звыш 50 манастыроў. У выніку ўніяцкая царква ахапіла сваім уплывам амаль усе сацыяльныя групы і ператварылася ў самастойны этнаканфесійны напрамак. Па ўмовах Берасцейскай уніі ўніяцкая царква падпарадкоўвалася рымскаму папе, службу вяла на царкоўнаславянскай або рускай (старабеларускай) мовах. Гэта шмат у чым прадвызначала той момант, што яе святары захавалі «рускую» або «літоўскую» самасвядомасць, і таму многія даследчыкі схільны разглядаць грэка-каталікоў у якасці прадстаўнікоў нацыянальнай царквы.

Другой па значнасці хрысціянскай канфесіяй на беларускіх землях была каталіцкая царква, якая прыйшла сюды ў XI–XIII стст. з Польшчы і Прыбалтыкі. Першымі каталіцкімі місіянерамі былі, як правіла, палякі і немцы. Аднак амаль да канца XIV ст. каталіцтва не атрымала шырокага распаўсюджання на Беларусі. Становішча змянілася толькі пасля Крэўскай уніі 1385 г., у адпаведнасці з якой вялікі літоўскі князь Ягайла за пасаду польскага караля прыняў каталіцкую веру і даў згоду распаўсюдзіць яе на Літву. Была дазволена дзейнасць манахаў дамініканскага і францысканскага ордэнаў, у Кіеве і Вільні створаны каталіцкія епархіі, праваслаўным феадалам было забаронена

займаць дзяржаўныя пасады. Гэта выклікала напружанасць у грамадстве, абвостраная ўнутрысаслоўная барацьба прывяла да таго, што ў 1563 г. вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст ураўняў у палітычных правах феадалаў каталікоў і праваслаўных. У грамаце адзначалася: «...ухваляем і хочем меци, иж от того часу, не только тые панове, шляхта и бояре, або потомкове их, всих земель наших того всего паньства нашего, дарованья привильев и наданья всих вольностей и прав земских уживати и с них ся веселити маютъ, которые суть поддани костелу Римскому… але теж и вси иные стану рыцерского и шляхецкого, яко Литовского, так и Русского народу, адно бы были веры християнское…»[16]

Такая пастанова адбылася ў пагоршанай для каталікоў сітуацыі, бо іх пазіцыі былі падарваны Рэфармацыяй. Аднак, пасля таго як у 1569 г. у ВКЛ прыехалі першыя пяць езуітаў: Пётр Скарга, Францішак Суньер, Антоній Пасевін, Станіслаў Лянчыцкі, Станіслаў Влошак, сітуацыя пачала змяняцца. Дзякуючы падтрымцы дзяржаўнай улады і дзейнасці езуітаў, пазіцыі касцёла пачалі адраджацца. Толькі ў Віленскім біскупстве, якое тэрытарыяльна ахоплівала амаль усе беларускія землі, было створана звыш 100 новых парафій. Асноўная іх канцэнтрацыя праходзіла ў зоне беларуска-літоўскага памежжа і ахоплівала землі на захад ад цэнтра Беларусі. Значнымі групамі каталіцкае насельніцтва было прадстаўлена ва ўсіх буйных гарадах. Атрымаўшы статус дзяржаўнай, каталіцкая царква ўплывала на свецкую ўладу, яе кіраўнікі былі прадстаўлены ў сенаце і сойме.

У этнічных адносінах каталіцкае духавенства было змешаным. Сярод яго былі як палякі, так і прадстаўнікі «ліцвінаў», «русінаў». Таму ў адносінах паміж ВКЛ і Польшчай часам узнікалі непаразуменні, бо згодна са статутнай нормай «дастоінства і ўрады» (пасады і званні) павінны былі замяшчацца ўраджэнцамі дзяржавы. У 1591 г. кароль Жыгімонт III Ваза прызначыў на пасаду віленскага біскупа паляка Б. Мацеўскага. Гэта выклікала рэзкі пратэст з боку пануючага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага. У прыватнасці, шляхта Берасцейскага ваяводства ў 1597 г. у адказ на просьбу караля дазволіць «яго міласці біскупства Віленскае, толькі на час, аддаць паляку» заявіла, што «такі дазвол будзе страшным і небяспечным, бо не адпавядае былым правам, прывілеям і звычаям, якія продкі караля яго міласці, гаспадара нашага, святой і вечнай памяці каралі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, не толькі продкам нашым шчодра далі, але таксама заўсёды вечна, непарушна захоўвалі і ўтрымлівалі»[17]. Берасцейскую шляхту падтрымалі ашмянскія, аршанскія, навагрудскія і іншыя паслы. У выніку пасля працяглай барацьбы ў 1600 г. віленскім біскупам стаў «родзіч тутэйшы» Бенядзікт Война[18].

Сярод хрысціянскіх канфесій на беларускіх землях у XVI–XVII стст. значнае месца займаў пратэстантызм. З'явіўшыся ў 30-я гг. XVI ст. у форме лютэранства, ён распаўсюджваўся місіянерамі з Германіі, Прусіі і Лівоніі пераважна ў буйных гарадах, дзе жыло нямецкае і латышскае насельніцтва. Таму гэтыя абшчыны былі невялікімі і аб'ядноўвалі этнаканфесійныя групы замежнага паходжання.

Больш шырокае распаўсюджанне ў ВКЛ атрымаў кальвінізм. Дзякуючы падтрымцы канцлера, віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Чорнага, яго асабістым сувязям з Ж. Кальвінам, гэты напрамак у пратэстантызме пачаў развівацца на беларускіх землях з 1553 г. і істотна паслабіў пазіцыі каталікоў. У многіх гарадах і мястэчках былі заснаваны абшчыны (зборы), сталі адчыняцца школы, шпіталі, друкарні. К канцу XVI ст. агульная колькасць кальвінскіх абшчын на Беларусі склала 92, а ў цэлым па ВКЛ іх было 190[19]. Арганізацыйна ўсе абшчыны былі аб'яднаны ў 6 акруг, большая частка з якіх ахоплівала беларускія землі. На пасады прапаведнікаў Мікалай Радзівіл Чорны актыўна запрашаў адукаваных людзей з еўрапейскіх краін, і ў ВКЛ прыехалі Сымон Зак, Фама Фальконій, Пётр з Ганендза і інш. Таму ў этнічных адносінах склад прапаведнікаў быў змешаны. Што ж тычылася паствы, то яна была мясцовай і ўключала ў сябе як «рускіх», так і «ліцвінаў».

Пад уплывам плебейскіх радыкалаў у 1565 г. кальвінізм раскалоўся і з яго вылучыўся антытрынітарызм, або арыянства. Арыяне адмаўлялі Святую Тройцу, уласнасць, не ўспрымалі прыгон, войны, патрабавалі роўнасці ўсіх саслоўяў. Сацыяльны радыкалізм выклікаў абурэнне феадальнай эліты, і ў 1658 г. сойм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб іх выгнанні за межы краіны. У выніку многія з'ехалі ў Прусію, Сілезію, Галандыю, Францыю, Англію.

Сярод духавенства на беларускіх землях былі прадстаўнікі іўдаізма і іслама, да якіх адносіліся нацыянальныя меншасці. З'явіўшыся на тэрыторыі ВКЛ у канцы XIV ст., яўрэі і татары кампактна жылі ў гарадах і мястэчках, вялі асабісты лад жыцця, што абумовіла іх пэўную этнаканфесійную адасобленасць. Яўрэі складалі ў XVI ст. ад 10 да 20 % ад колькасці гарадскога насельніцтва і мелі каля 50 сінагог і малітоўных дамоў. Адносна татараў можна сцвярджаць, што іх налічвалася каля 10 тыс. і яны пражывалі ў раёнах Ліды, Міра, Іўя, Ашмян, Клецка і іншых мясцін – менавіта там, куды іх накіравала цэнтральная ўлада[20]. Святарамі ва іўдзеяў і мусульман былі прадстаўнікі адпаведнай нацыянальнасці.

Такім чынам, аналіз этнаканфесійнай сітуацыі, якая склалася на беларускіх землях у разглядаемы перыяд, яскрава сведчыў аб тым, што на пасады духавенства прызначаліся прадстаўнікі карэнных нацыянальнасцей. Аднак у выпадках, калі іх пачыналі замяшчаць іншаземцы, палітычная эліта дзяржавы дабівалася патрэбнага для сябе рашэння.

[1] Гл.: Вялікае Княства Літоўскае: Энцыкл.: У 2 т. Мінск, 2005. Т. 1. С. 83.
[2] Гл.: Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000. С. 60.
[3] Гл.: АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 37.
[4] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Т. 1. С. 450.
[5] Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док. и материалов. Минск, 1959. Т. 1. С. 389.
[6] Ламанский В. И. Белая Русь // Имя твое Белая Русь. Минск, 1991. С. 17.
[7] АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 73, 120.
[8] АЗР. СПб., 1848. Т. 2. С. 279.
[9] ПСРЛ. М.; Л., 1963. Т. 28. С. 89.
[10] АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 237.
[11] Гл.: Вялікае Княства Літоўскае. С. 75.
[12] Вестник Западной России. Вильно, 1868. Кн. 6. Т. 2. С. 62.
[13] Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2002. С. 75–76.
[14] Уния в документах. Минск, 1997. С. 203–204.
[15] Там жа. С. 195.
[16] Там жа С. 80.
[17] АВАК. Вильно, 1867. Т. 2. С. 152.
[18] Гл.: Лойка П. А. Указ. тв. С. 72.
[19] Гл.: Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. С. 66.
[20] Там жа. С. 66–67.

Паступіў у рэдакцыю 20.09.12.

*Юрый Леанідавіч Казакоў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў.

*Н. В. КАРПОВІЧ*

## ЗМЕНЫ Ў СТРУКТУРЫ ПРАВАСЛАЎНЫХ ПРЫХОДАЎ У БЕЛАРУСІ Ў 1860–1890-х гг.

Рассматриваются факторы, оказавшие влияние на изменение структуры православных приходов во второй половине XIX в. Анализируются причины и последствия реформирования православных приходов. Характеризуются особенности установления территориальных границ приходов, их численность; определен штатный состав приходского духовенства, его структурные особенности. Отмечается, что изменения в структуре приходов на территории Беларуси имели свои специфические черты.

In that article there are showed the factors which had influence on reorganization of orthodox parishes in Belarus during the second half of the 19 th century. Causes and results of reorganization parishes are analyzed. The limit of orthodox district, number of peasants is characterized; the influences of service structure on staff of orthodox estate are analyzed. The specific traits of orthodox parishes in Belarus are marked.

У перыяд царкоўных рэформ 1860–1870-х гг. палітыка ўрадавых колаў была скіравана на аднаўленне эфектыўнай дзейнасці праваслаўных прыходаў. Менавіта духавенству адводзілася галоўная роля ў рэалізацыі гэтых задач. Праваслаўнае духавенства займалася трансляцыяй урадавых праграм, абнародавала ўказы імператара, а таксама прымала актыўны ўдзел у вырашэнні сацыяльных праблем грамадства. Новыя задачы патрабавалі перагляду пазіцый духавенства, звязаных з вызначэннем яго прававога і сацыяльнага статусу. Іх рэалізацыя пры адначасовым павелічэнні стандартаў царкоўнай службы выклікала змены ў самой структуры прыхода. На тэрыторыі Беларусі ва ўмовах узмоцненай русіфікацыі дадзены працэс быў адметным у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз змен у структуры праваслаўных прыходаў Беларусі ў другой палове XIX ст. У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі праз прызму характарыстыкі канфесійнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ў працы В. Яноўскай[1] знайшлі адлюстраванне асобныя аспекты па абазначанай праблеме. У той жа час расійскімі аўтарамі С. Рымскім[2], В. Фёдаравым[3] паказаны мерапрыемствы ўрада ў накірунку рэфармавання прыходаў у кантэксце царкоўных рэформ. Але спецыфіка ўказаных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў іх атрымала фрагментарнае асвятленне.

Праваслаўны прыход складаўся з прычту (прыхадскога духавенства) і прыхаджан, якія пражывалі ў межах праваслаўнага храма. Прыхадское духавенства складала асноўную масу белага духавенства. У Беларусі ў праваслаўных прыходах пражывала ў канцы XIX ст. 84,2 % духавенства. Прычт складаўся з трох асноўных груп – святароў, дыяканаў і прычэтнікаў. Прадстаўнікі кожнай групы мелі розны духоўны статус і адпаведна яму – розныя абавязкі пры выкананні царкоўных абра-